Васіль СУДНІК

# ЦАРКВА І РЭЛІГІЯ

### VII клас

*У XIV — першай палове XVI стагоддзя ў Заходняй Еўропе абвастрыліся адносіны паміж рознымі хрысціянскімі канфесіямі, што прыводзіла да рэлігійнай варожасці і войнаў. У Вялікім Княстве Літоўскім удалося захаваць этнічны і рэлігійны мір. Пра тое, як і чаму гэта адбылося, вучні даведаюцца на ўроку.*

**Мэта ўрока:** сфарміраваць у вучняў цэласнае ўяўленне пра становішча праваслаўнай і каталіцкай цэркваў у ВКЛ у канцы XIV—сярэдзіне XVI ст. і паказаць значэнне рэлігіі для тагачаснага грамадства.

**Задачы ўрока:** пазнаёміць вучняў са змяненнем становішча праваслаўнай і каталіцкай цэркваў, вызначыць значэнне прывілея 1563 г., забяспечыць вывучэнне новых паняццяў; садзейнічаць развіццю ўменняў і навыкаў вучняў працаваць з рознымі крыніцамі ведаў, знаходзіць прычынна-выніковыя сувязі, працаваць у парах і групах; выхоўваць у вучняў цікавасць да гісторыі рэлігіі, павагу да прадстаўнікоў розных канфесій, рэлігійных каштоўнасцей.

**Тып урока:** урок вывучэння новага матэрыялу.

**Паняцці:** *парафія, рэлігійная талерантнасць.*

**Даты:** *1387 г., 1413 г., 1563 г.*

**Забеспячэнне ўрока:** Гісторыя Беларусі: другая палова XIII — першая палова XVI ст.: вучэб. дапам. для 7-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. мовай навучання / Г.В.Штыхаў, Ю.М.Бохан, М.А.Краснова; пад рэд. Ю.М.Бохана. Мн., 2009; мультымедыйны праектар; прэзентацыя.

**План урока**

I. Арганізацыйна-матывацыйны этап.
II. Праверка дамашняга задання.
III. Вывучэнне новага матэрыялу.
1. Палітыка дзяржавы ў адносінах да царквы.
2. Становішча праваслаўнай царквы.
3. Умацаванне пазіцый каталіцтва.
4. Рэлігійная талерантнасць у ВКЛ.
IV. Праверка вынікаў самастойнай работы.
V. Кантроль, самаправерка і карэкцыя ведаў вучняў.
VI. Дамашняе заданне.



**СУДНІК Васіль Пятровіч.**
*Настаўнік гісторыі Дзераўнянскай СШ Стаўбцоўскага раёна. Нарадзіўся ў г. Баранавічы ў 1951 г. Закончыў у 1974 г. філалагічны і ў 1986 г. гістарычны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М.Горкага. Настаўнічае з 1973 г., а ў Дзераўнянскай СШ — з 1976 г. Узнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства народнай асветы БССР. Аўтар шэрага артыкулаў па краязнаўству, нарысаў аб удзельніках Вялікай Айчыннай вайны, надрукаваных у раённай газеце "Прамень", рэспубліканскіх газетах "Краязнаўчая газета", "Літаратура і мастацтва", "На страже", часопісах "Беларускі гістарычны часопіс", "Беларуская думка". Мае вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю.*

gisdapanoga.bspu.by

**Афармленне класнай дошкі:** запісваецца тэма ўрока, асноўныя гістарычныя паняцці і даты. На левай палавіне дошкі запісаны эпіграф да ўрока і праблемнае пытанне, а на правай — пытанні, змешчаныя ў пачатку § 23. На пачатку ўрока дошка закрыта адкіднымі палавінамі. На левай адкіднай палавіне дошкі напісана наступнае азначэнне: *супольнасць веруючых, заснаваная на раздзяленні іх на духавенства і радавых веруючых.*

На правай адкіднай палавіне напісана наступнае: *вера ў існаванне звышнатуральных сіл (багоў, духаў, анёлаў і інш).*

На дошцы запісаны эпіграф:

*... А меновите то поприсегнути: покой посполитый межы розорваными и розными людьми в вере и набоженстве заховывать...*

***Статут ВКЛ 1588 г. Раздзел III. Артыкул 3.***

## Ход урока

### I. Арганізацыйна-матывацыйны этап.

Настаўнік спрыяе ўсталяванню эмацыянальна-пазітыўнага настрою вучняў, рыхтуе іх да плённай працы, правярае дамашняе заданне.

### II. Праверка дамашняга задання *(да 4 хв.)*

Праверка ведаў вучняў па тэме "Этнічныя меншасці ў ВКЛ" ажыццяўляецца шляхам франтальнага апытання вучняў па пытаннях, змешчаных на старонках 121—122 вучэбнага дапаможніка.

### III. Вывучэнне новага матэрыялу.

Вучні называюць паняцці, азначэнні якіх напісаны на адкідных баках дошкі: вера ў існаванне звышнатуральных сіл (багоў, духаў, анёлаў і інш). *(Рэлігія);* супольнасць веруючых, заснаваная на раздзяленні іх на духавенства і радавых веруючых. *(Царква.)*

Пасля гэтага дошка адкрываецца, адзін з вучняў зачытвае тэму ўрока, план урока, эпіграф і праблемнае пытанне: *Да чаго прывяло распаўсюджванне ў ВКЛ рэлігійнай талерантнасці?*

Для таго каб актуалізаваць раней вывучаны матэрыял, вучні адказваюць на пытанні, змешчаныя на пачатку § 23. Настаўнік задае ўдакладняючае пытанне: *У якіх умовах была падпісана Крэўская унія?* Вучні адказваюць на яго.

Затым настаўнік паказвае слайд з выявай касцёла Звеставання Дзевы Марыі ў в. Дзераўная Стаўбцоўскага раёна і задае пытанне: *Які храм вы бачыце на экране? (слайд 1 )*

Заслухаўшы адказы вучняў, настаўнік коратка расказвае пра касцёл. Гэта помнік архітэктуры эпохі Рэнесансу першай паловы XVII ст. Касцёл быў пабудаваны па фундацыі Мікалая Крыштофа Радзівіла Сіроткі. Верагодна, што храм будаваўся пад кіраўніцтвам віленскага каноніка Войцаха Сялявы. У другой палове XVII ст. надбудавана вежа, у пачатку XVIII ст. адрэстаўраваны.

Пасля агучвання інфармацыі пра храм настаўнік задае пытанне: *Якую функцыю цяпер выконвае храм?*

Каб перайсці да вывучэння новага матэрыялу, ён прапануе вучням сфармуляваць задачы вучэбнай дзейнасці на ўроку і затым абагульняе іх адказы.

**Задачы вучэбнай дзейнасці:** пазнаёміцца са змяненнем становішча праваслаўнай і каталіцкай цэркваў; вызначыць значэнне прывілея 1563 года; вывучыць новыя паняцці і засвоіць даты.

Клас дзеліцца на 4 групы па колькасці пунктаў у § 23 вучэбнага дапаможніка. Кожная група чытае адпаведны пункт вучэбнага дапаможніка і афармляе выхадную картку свайго задання *(да 10 хв.).*



*Касцёл Звеставання Дзевы Марыі ў в. Дзераўная Стаўбцоўскага раёна.*



gisdapamoga.bspu.by

**Выхадная картка** *(слайд 2)*

1. Вызначыць асноўную думку тэкста гэтага пункта параграфа.

2. Падрыхтаваць пытанне па прачытаным тэксце.

3. Коратка адказаць на яго адным сказам.

**IV. Праверка вынікаў самастойнай работы** *(да 5 хв.)*

Кожная група агучвае свой адказ. Затым настаўнік прапаноўвае для параўнання свае карткі.

**Палітыка дзяржавы ў адносінах да царквы** *(слайд 3)*

1. Пасля заключэння Крэўскай уніі ў 1385 г. рэлігійная палітыка ў Вялікім Княстве Літоўскім памянялася. Каталіцкае духавенства аказалася ў прывілеяваным становішчы.

2. Што спрыяла царкоўнай уніі, але чаму яна практычна не адбылася?

3. Каталіцкае духавенства не жадала, каб праваслаўная царква мела падобныя як у каталіцкага касцёла правы і прывілеі, а праваслаўнае насельніцтва цвёрда прытрымлівалася сваіх традыцый.

**Становішча праваслаўнай царквы** *(слайд 4)*

1. Заключэнне Крэўскай уніі мела негатыўныя вынікі для праваслаўнай царквы.

2. Што было надзвычай важным для праваслаўнай царквы з канца XIV ст. і чаму?

3. Надзвычай важнае значэнне для праваслаўя атрымала падтрымка праваслаўнай царквы з боку свецкіх асоб — магнатаў, шляхты, мяшчан, бо яна не мела такой апекі кіраўніцтва ВКЛ, як каталіцкі касцёл.

**Умацаванне пазіцый каталіцтва** *(слайд 5)*

1. З 33 каталіцкіх парафій, заснаваных у ВКЛ да сярэдзіны XVI ст., 22 былі створаны ў Беларусі. Тут знаходзілася каля дзвюх трацей усіх уладанняў Віленскага біскупства.

2. Ці спрыяла дзейнасць каталіцкага манаства ўмацаванню каталіцтва?

3. Каталіцкія манаскія ордэны ўмацоўвалі пазіцыі каталіцкай веры, якая трывала звязвала ВКЛ з Польскім Каралеўствам.

**Рэлігійная талерантнасць у ВКЛ** *(слайд 6)*

1. У 1563 г. быў прыняты прывілей, паводле якога феадалы ўсіх хрысціянскіх канфесій ураўноўваліся ў правах.

2. З чым звязана аслабленне пазіцый каталіцкага касцёла ў першай палове XVI ст.?

3. Яно звязана з пранікненнем і пашырэннем пратэстанцкіх ідэй у ВКЛ, а таксама з пазіцыяй вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста, які хацеў аб'яднаць усіх хрысціян. Да сярэдзіны XVI ст. у ВКЛ усталявалася адносна *рэлігійная талерантнасць, або верацярпімасць.*

Затым адзін з вучняў зачытвае гістарычную крыніцу "З прывілея вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста" на с. 126 вучэбнага дапаможніка, і вучні адказваюць на пытанне, што змешчана пад дакументам.

Пасля абмеркавання гістарычнай крыніцы вучні запісваюць у рабочыя сшыткі новыя паняцці і даты.

*Парафія* — абшчына вернікаў, якая адносіцца да адной царквы.

*Рэлігійная талерантнасць* — спрыяльнае стаўленне да людзей розных канфесій, верацярпімасць.

*1413 г.* — выданне Гарадзельскага прывілея, паводле якога толькі католікі маглі займаць вышэйшыя пасады ў ВКЛ.

*1563 г.* — выданне прывілея, які ўраўноўваў у правах прадстаўнікоў усіх хрысціянскіх канфесій.

Пасля запісу ў сшыткі новых паняццяў і дат клас заслухоўвае паведамленне вучня пра Рыгора Цамблака.

**Рыгор Цамблак *(1364—каля 1420)* — праваслаўны царкоўны дзеяч ВКЛ і прапаведнік**

*Паходзіў са знатнага балгарскага роду, атрымаў царкоўную адукацыю ў Грэцыі. У сувязі з турэцкім нашэсцем у 1393 г. Рыгор Цамблак вымушаны быў пакінуць радзіму і весці падзвіжніцкае жыццё ў суседніх краінах — Візантыі, Малдове, Сербіі, Вялікім Княстве Літоўскім.*

*Па запрашэнню мітрапаліта "кіеўскага і ўсяе Русі" Кіпрыяна (быў яго дзядзькам) выехаў у Маскву. Аднак па дарозе, знаходзячыся на тэрыторыі ВКЛ, даведаўся пра смерць мітрапаліта і застаўся ў Княстве, дзе стаў вядомым прапаведнікам. Пытанне пастаўлення новага мітрапаліта прывяло да канфлікту паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай. Па патрабаванню вялікага князя літоўскага Вітаўта ў 1415 г. у Навагрудку быў скліканы царкоўны сабор, на якім мітрапалітам кіеўскім быў абраны Рыгор Цамблак. Гэта адбылося без згоды канстанцінопальскага патрыярха, але садзейнічала ўнутранаму ўмацаванню ВКЛ. У 1416 г. цэнтрам праваслаўнай мітраполіі стала Вільня, бо Кіеў быў спустошаны ў выніку набегу ардынскага войска.*

*Рыгор Цамблак выступаў за раўнапраўнае ўзаемадзеянне рэлігій, вырашэнне спрэчных пытанняў шляхам дыялогу, а не прызнання дагматаў адной канфесіі другой. Ён лічыў, што менавіта на беларускіх землях перасякаліся каталіцкія і праваслаўныя традыцыі, і выступаў за аб'яднанне царквы.*

*Католікі, хоць і ўхвалялі рэлігійную пазіцыю Р.Цамблака, меркавалі, што той, хто падтрымлівае каталіцкую рэлігію, павінен стаць католікам. У Маскоўскай дзяржаве яго вінавацілі ва ўніяцтве, называлі "адступнікам ад праваслаўя".*

*Захавалася больш за два дзясяткі твораў Р.Цамблака на старажытнаславянскай мове — пропаве-*



gisdadaroga.bspu.by

*дзі, пахвальныя словы. Яго пропаведзі былі незвычайныя па форме, бо пісаліся яскравай мовай. Пахвальныя словы адметны цікавым апісаннем гістарычных дзеячаў, маляўнічым апісаннем прыроды. Творы Р.Цамблака карысталіся вялікай папулярнасцю на ўсходнеславянскіх землях.*

*Нягледзячы на крытыку дзейнасці Р.Цамблака ўсходнімі і заходнімі багасловамі, ён істотна ўплываў на рэлігійнае жыццё ў ВКЛ. (Антонаў В. Грыгорый І Цамблак // Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя. У 2 т. Т. 1. Мн., 2005. С. 557.)*

Пасля паведамлення вучня пра Рыгора Цамблака класу задаецца пытанне: *Якую ідэю хацеў ажыццявіць Рыгор Цамблак на беларускіх землях?*

**Сістэматызацыя і замацаванне ведаў** *(да 4 хв.)*

Настаўнік прапануе вучням сістэматызаваць і ўспомніць паняцці і даты вывучаемай тэмы *(слайд 7)*.

*Заданне.* Насупраць даты пазначце падзею, якая адбылася; насупраць назвы падзеі — дату; насупраць паняцця — яго азначэнне; насупраць азначэння — паняцце, якое характарызуецца.

1054 г. — ...; Крэўская унія — ...; 1387 г. — ...; Заканадаўчае афармленне ў правах усёй шляхты незалежна ад канфесійнай прыналежнасці — ...; Рэлігійная талерантнасць — ...; Абшчына вернуючых, якая належыць да адной царквы — ...

Пасля адказаў вучняў паказваецца *слайд 8*, каб вучні лепш запомнілі і замацавалі веды.

1054 г. — падзел царквы на каталіцкую і праваслаўную плыні.

Крэўская унія — 1385 г.

1387 г. — стварэнне Віленскага біскупства.

Заканадаўчае афармленне ў правах усёй шляхты, незалежна ад канфесійнай прыналежнасці — 1563 г.

Рэлігійная талерантнасць — спрыяльнае стаўленне да людзей розных канфесій.

Абшчына веруючых, якая належыць да адной царквы, — парафія.

**V. Кантроль, самаправерка і карэкцыя ведаў вучняў** *(да 3 хв.)*

Настаўнік вяртаецца да праблемнага пытання, пастаўленага ў пачатку ўрока: Да чаго прывяло распаўсюджванне ў ВКЛ рэлігійнай талерантнасці?

Адказ на праблемнае пытанне. *(слайд 9)*

- спыніла ўнутраныя канфлікты ў краіне на рэлігійнай глебе;
- зменшыла напружанасць у дзяржаве;
- павысіла давер да ўлады;
- умацавала ўладу ў дзяржаве.

**Падвядзенне вынікаў** *(да 5 хв.)*

Кожнай з груп прапануецца скласці сінквейн са слоў: 1-я група — царква, 2-я група — рэлігія, 3-я група — парафія, 4-я група — талерантнасць.

**Сінквейн** *(слайд 10)*

1. У першым радку тэма называецца адным словам (назоўнік).
2. Другі радок — апісанне тэмы ў двух словах (два прыметнікі).
3. Трэці радок — апісанне дзеяння ў рамках гэтай тэмы трыма словамі.
4. Чацвёрты радок — кароткі сказ, які паказвае адносіны да тэмы.
5. Апошні радок — сінонім з аднаго слова, які паўтарае сутнасць тэмы.

Пасля выступленняў груп афармляюцца наступныя сінквейны, складзеныя вучнямі.

*Слайд 11*

Царква
светлая, моцная
аб'ядноўвае, заклікае, дзейнічае
Адыгрывае важную ролю ў жыцці.
Супольнасць

*Слайд 12*

Рэлігія
праўдзівая, вечная
умацоўвае, дапамагае, змякчае
Надзея людзей на лепшае ў жыцці.
Вера

*Слайд 13*

Парафія
праваслаўная, каталіцкая
існуе, належыць, умацоўвае
Аб'ядноўвае веруючых у Бога.
Абшчына

*Слайд 14*

Талерантнасць
рэлігійная, справядлівая
існуе, збаўляе, асвятляе
Аб'ядноўвае ўсіх людзей у краіне.
Верацярпімасць

Затым настаўнік прапануе вучням звярнуцца да вучэбных задач урока, эпіграфа і задае пытанні: Ці адпавядае эпіграф тэме ўрока, ці выкананы вучэбныя задачы? Якая ўнікальная з'ява ва ўмовах рэлігійнага супрацьстаяння ў краінах Заходняй Еўропы выявілася ў ВКЛ? *(У ВКЛ удалося ўсталяваць рэлігійную талерантнасць, ці верацярпімасць, што прывяло да міру ў краіне.)*

Настаўнік выстаўляе і каменціруе адзнакі за работу на ўроку.

**VI. Дамашняе заданне** *(да 2 хв.)*

*Абавязковае:* прачытаць § 23 вучэбнага дапаможніка, вусна адказаць на пытанні да яго; *дадатковае:* даведацца, прадстаўнікі якіх канфесій пражываюць у нашай мясцовасці, сабраць звесткі пра гісторыю мясцовага храма (матэрыял да ўрока "Наш край").



gisdapamoga.bspu.by